Но в Акте Областной комиссии по городу Бобруйску отмечалось: «Комиссия ещё по неполным данным считает, что в г. Бобруйске и её ближайших окрестностях немецко-фашистскими властями и командованием Германской армии только в обследованных местах истреблено Советских граждан и военнопленных свыше 80.000 человек» [2, л.2].

Интересным представляется, вопрос: как в данных ЧГК отражена национальность жертв? Согласно Всесоюзной переписи 1939 г. Бобруйск перед началом войны представлял собой многонациональный город, в котором проживало около 40000 белорусов, 27000 евреев, 12 000 русских и представители других национальностей. Во всех известных мне документах, акцент на национальность погибшего не делался, давалось пояснение убитые и замученные советские граждане.

Тем не менее, не смотря на некоторые неточности при установлении количества жертв, ЧГК и её местные комиссии проделали очень сложную и нужную работу. Материалы комиссии были использованы в качестве доказательств на различных судебных процессах, в том числе и на Нюрнбергском МВТ в 1946 году.

## ЛИТЕРАТУРА


1. ЗАГБоб. Фонд 1569. – Оп.3. – Д.3. Доклад «Об итогах работы Бобруйской областной комиссии содействия в работе Чрезвычайной Государственной Комиссии»

2. ЗАГБоб. Фонд 1569. – Оп.3. –Д.6. – Л.3 – 11.Акт Бобруйской областной комиссии расследования фактов истребления советских граждан немецко-фашистскими захватчиками на территории



УДК 398.3(476.1)



Вуч. К. А. Жукоўская

Навук. кіраўнік С. М. Раманіва, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства

(ДУА “Лешніцкі навучальна–педагагічны комплекс дзіцячы сад –сярэдняя школа”)


## ВОБРАЗЫ І СІМВАЛЫ РУЧНІКОЎ БЯРЭЗІНШЧЫНЫ

Што мы сёння ведаем пра беларускі арнамент? Нягледзячы на тое, што на гэтую тэму напісана і выдадзена шмат навуковых работ, сучасны беларус разумее ў вышытых сімвалах продкаў няшмат. Вывучэнне традыцый беларускіх ручнікоў застаецца незавершаным. Гэта абумоўлівае актуальнасць выбранай тэмы.

Аб’ектам даследавання з’яўляецца беларускі народны ручнік, арнамент вышытых і вытканых ручнікоў Бэрэзіншчыны. Мэта:

дасканала даследаваць тэму беларускіх ручнікоў у побыце бярэзінцаў, спазнаць сімволіку іх ўзораў і колераў.

Задачы:

- развіваць уменне самастойна даследаваць і здабываць веды з розных крыніц і выкарыстоўваць іх ва ўласнай дзейнасці;
- выявіць асаблівасці ўзораў паводле колеру, характару малюнка і яго размяшчэння;
- сабраць інфармацыю пра ручнікі Бярэзіншчыны, вызначыць іх віды і сімвалы на прыкладзе мясцовых ручнікоў;
- выхоўваць паважлівыя адносіны, клопат, цікавасць да культурных здабыткаў свайго народа;

Беларускі ручнік адносіцца да тых прадметаў народнага мастацтва, якія належаць і мінуламу, і сучаснасці. Папулярнасць яго нязменная, патрэба ў ім адчуваецца і ў нашы дні. Па прызначэнні ручнікі бываюць: утылітарна-бытавыя; абрадавыя (радзінна-хрэсьбінныя, вясельныя, пахавальныя); рытуальныя); аброчныя; святочна-дэкаратыўныя. Ручнікі ўтылітарныя паўсюдна на Беларусі называюцца ўціральнік, уцірач, уцірка (а таксама – “трапкач”, “скарач”, “патрэпнічак,“надзёжнік”) [1]. Як правіла, гэта кавалак тканіны без дэкору ці з вузенькімі палоскамі-пэратыкамі па краях, − якія выкарыстоўваюць для побытавых патрэб (імі ў паўсядзённым жыцці выціралі рукі і твар). Прычым на патрэбу сям’і выдзяляўся толькі адзін ручнік, які звычайна вісеў пасярэдзіне сцяны.

Па-ранейшаму ручнік абавязкова прысутнічае ў найбольш важныя, пераломныя этапы жыццёвага шляху чалавека – вяселлі, народзінах і хрэсьбінах, провадах ў апошні шлях. Без традыцыйнага ручніка не абыходзіцца зараз ніводная больш-менш значная выстава народнага мастацтва. Гэта адносіцца і да нашага краю – у многіх хатах на Бярэзіншчыне прынята даставаць традыцыйныя  ручнікі на вялікае свята. Прааналізуем самыя распаўсюджаныя сімвалы беларускіх ручнікоў на прыкладзе ручнікоў, перададзеных жыхарамі вёскі Лешніца ў дар краязнаўчаму гуртку “Спадчына.

Кожны з ручнікоў меў свой арнамент і свой колер. Асноўны колер старых узораў – чырвоны, колер самога Сонца, колер агню, цеплыні, чалавечай крыві. Белы колер – гэта дзённае святло, колер малака, вады, што наталяе смагу, колер чысціні. А спалучэнне белага  і чырвонага паўстала як сімвал жыцця, шчасця, працвітання. Сярод ручнікоў, захаваных у маёй вёсцы, пераважаюць вытканыя сімвалы сонца, зямлі, маці, сярод колераў – чырвоны і белы.

У якасці фарбаў для пражы выкарыстоўвалі расліны. Чорны колер атрымлівалі пры дапамозе бабоўніку ці змешвалі сок буракоў з

настоем кары вольхі. Чырвоны – рабілі з настою валошкі, адвару сырой кары рабіны. Для зялёнага колеру выкарыстоўвалі лісты бярозы. Самымі ўлюблёнымі, канешне ж, былі знакі, прысвечаныя Сонцу: круг, крыж (святло, што разыходзіцца на ўсе чатыры бакі), круг з крыжам, кола з шасцю спіцамі, якія з цягам часу ператварыліся ў “зорачкі са шматлікімі варыянтамі”.

Ромб сімвалізаваў Сонца па той прычыне, што ў ткацтве, як і ў традыцыйнай вышыўцы крыжам, тэхнічна немагчыма выткать або вышыць кола (круг). Народ верыў, што сонейка заўсёды перасільвала цемру ночы, і ў гэтым чэрпаў веру, што ўсё светлае, добрае, справядлівае пераможа. Такі ж ромб, але прамянямі накіраваны унутр, – Зямля. Каб выказаць ідэю росквіту прыроды, жыцця сімвал Сонца змяшчаецца ў сімвал Зямлі. Жыццё – каб паказаць ідэю жыцця, росквіту і адзінства ўсяго існуючага, сімвал памяшчалі унутры зямнога. Вобраз чалавека – таксама зорка, але яе чатырохвугольная кайма значна прасцейшая, ланцужковая. Сімвал ураджаю – гэта ўжо не зорка, а разетка, скампанаваная з чатырох жытнёвых каласкоў, размешчаных пад прамым вуглом. У тканых і вышываных ручніках пашыраны сімвал Берагіні. Паводле павер’яў, Берагіня вясною клапоціцца, каб жанчына-сялянка не галадала, летам – каб не захварэла ад цяжкай працы, восенню памагае ёй пры родах, а зімою абагравае яе і дзетак. Цяжкай і бязрадаснай была калісьці доля жанчыны. Вечная цяжкая, непасільная праца, бяспраўнасць, суровыя адносіны з боку мужавай радні, а то і самога мужа, былі пастаяннымі спадарожнікамі жанчыны. Жаночая доля звычайна ўвасабляецца ў выглядзе пышнага рознакаляровага букета ці вазона, падобнага на тыя, што стаяць на падаконніках. Увогуле сімвал жаночай долі больш правільна было б называць мараю пра лепшую жаночую долю. Такое цяжкае, бязрадаснае было жыццё сялянкі – і такі пышны, маляўнічы букет. Сімвалы жаночай долі, якімі майстрыхі аздаблялі свае ручнікі, не толькі просьбы ці мары. Гэта яшчэ і сведчанне паэтычнасці душы народа, высокага эстэтычнага густу.

Для большасці сённяшніх беларусаў арнамент на ручніку – проста ўпрыгожванне і не больш за тое. І мала хто памятае, што за ўсімі гэтымі узорамі хаваецца глыбокі сэнс. “ Што ні узор – то сімвал. Узоры тканых і вышываных вырабаў – зашыфраваны аповяд пра жыццё народа, прыроду, людзей” [4, с. 9].

Зараз сярод моладзі ўзрастае цікавасць да беларускага арнаменту, усё больш папулярным становіцца адзенне з вышытай нацыянальнай сімволікай, вядомыя беларускія дызайнеры і брэнды (Mark Formelle, Honar) шырока выкарыстоўваюць адметнасць беларускага арнаменту ў сваіх калекцыях.

Мабыць, пра саміх сябе, пра сувязь чалавека з прыродай, з сусветам, з космасам нашы продкі ведалі значна больш, чым мы. Напэўна, і мы з цягам часу зможам зразумець шмат з таго, што здаецца сёння незразумелым, і тым самым пазнаем сябе, сваю душу, псіхалогію, беларускі нацыянальны характар. І няхай праходзяць гады, мяняюцца густы, але пакуль побач з чалавекам будзе жыць пачуццё прыгожага, імкненне да натуральнага, сапраўднага – будзе жыць ручнік, бо спрадвечнае застаецца вечным.

## ЛІТАРАТУРА


1. Лабачэўская, В.А. Ручнік: лакальныя асаблівасці ручнікоў – выкарыстанне ў абрадах і мастацкія традыцыі. – Культура № 21 (787) 26.05.2007 - 01.06.2007
2. Кухаронак Т.І. Ручнік у прасторы і часе: Матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. 19-20 ліст. 1998 г. / Агул. рэд. В.А.Лабачэўскай. – Мінск: БелІПК, 2000.—188с. С. 103 – 107.
3. Фадзеева В.Я. Беларуская народная вышыўка. – Мінск, 1991
4. Кацар М.С. Беларускі арнамент. – Мінск,1996



УДК 371.65



Учащ. В. К. Загайский

Науч. рук. Н. В. Сокол, учитель русского языка и литературы

(ГУО «Средняя школа №2 г.Березовки»)


## ИЗ СЕМЕЙНОГО АРХИВА В ШКОЛЬНЫЙ МУЗЕЙ. ДОЛГ ПАМЯТИ

Богатство каждого человека заключается в его семье, а сила каждой семьи – в единстве ее поколений, почитании и уважении традиций, знании истории. Красной нитью через историю многих семей проходят 1941 – 1945 годы, годы Великой Отечественной войны.

Великая Отечественная война стала страшным испытанием для всех. Но время стремится вперед. Поколение участников и свидетелей войны уходит. Тема памяти, сохранения исторической преемственности **актуальна** как никогда.

Прадедушка Волосюк Михаил Павлович и прабабушка Волосюк Нина Фёдоровна – участники Великой Отечественной войны. Мой долг как потомка – сохранить память о защитниках нашей земли и передать её следующим поколениям, чтобы не терять связь времён.

**Тема работы:** Из семейного архива – в школьный музей. Долг памяти.

**Цель работы:** сохранение памяти о Великой Отечественной войне и воинском подвиге защитников Отечества.